ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЛЮТАГА 2018 г. ЧАЦВЕР № 22 (28638)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Ведала — буду артысткай»



«Універсітэт 3.0»: да новай мадэлі



Вартавы прыроды

# Музычны прыпынак




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:**

*«Для нас прадстаўлена выдатная магчымасць — Указ № 462 аб дзесяцідзённым бязвізавым рэжыме ў чатырох раёнах Брэсцкай вобласці і Брэсце. Многія, падобна, чакаюць яшчэ чагосьці. Давайце вырашым, што ўсе старшыні гар-, райвыканкамаў, на якіх гэты рэжым распаўсюджваецца, персанальна адказныя за работу па прыёме турыстаў. Гэта новыя працоўныя месцы, падаткі ў мясцовыя бюджэты. Само яно не прыйдзе, для гэтага трэба вельмі сур'ёзна працаваць з тураператарамі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9803 | ▼ |
| Еўра | 2,4618 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0352 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0711 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Па-чалавечы

## РАТУЮЧЫ ПРЫРОДУ, ДАПАМАГАЕМ ДУШЫ

### Як беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя звязаны з нашым унутраным светам?

**Чаму б не закіпяціць поўны чайнік вады, калі трэба заварыць усяго толькі кубак гарбаты? Навошта ездзіць на веласіпедзе, калі на машыне зручней? У нашым жыцці існуе велізарная колькасць звычак, на якія мы з часам перастаём звяртаць увагу. Але яны становяцца не толькі другой натурай: ад звычак залежыць свет, у якім мы жывём. Як мінімум — экалагічная сітуацыя ў краіне, рэгіёне і, па вялікім рахунку, свеце. Пра тое, чаму важна беражлівая стаўцца да навакольнага асяроддзя і як гэтаму навучыцца, распавядае інтэрактыўная выстаўка «Чалавек і тварэнне».**

СТАР. 13




З гэтага стэнда ўсё пачынаецца.

■ Занятасць

## ДОБРЫ ЧАС ДЛЯ САІСКАЛЬНІКАЎ

### Чаго чакаць ад рынку працы сёлета

**Ці стане прасцей знайсці работу? Што будзе з зарплатамі? Каму варта задумацца аб змене прафесіі? Мы папрасілі экспертаў падзяліцца прагнозамі на бягучы год.**

### Рынак — у стане раўнавагі

На пачатак года ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 0,5 працэнта.

— Мяркуем, што рынак прыйшоў у стан раўнавагі. Сёлета мы не чакаем скачкоў у росце колькасці беспрацоўных, — дзеліцца бачаннем сітуацыі **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.** — Колькасць вакансій, па нашых ацэнках, будзе трымацца ў межах 50—60 тысяч, таму напружанасць на біржы наўрад ці вырасце. Цяпер на адну вакансію прыпадае 0,4 беспрацоўнага.

Згодна з інфармацыяй Белстата, летась рэальная заработная плата па краіне была на шэсць працэнтаў большая, чым у 2016-м. Самы прыкметны рост заробкаў назіраўся ў такіх відах дзейнасці, як лесаводства і лесанарыхтоўкі (плюс 16 %), металургічная вытворчасць (плюс 13,5 %), вытворчасць аўтамабіляў і прычэпаў (плюс 13 %), транспартных сродкаў і абсталявання (плюс 12 %). Ці захаваецца гэта тэндэнцыя сёлета?

СТАР. 4